# ДОБРАЯ ТРАДЫЦЫЯ ЖЫВЕ

Беларускі фонд культуры з пачатку свайго існавання плённа працуе на карысць бібліятэк рэспублікі. Менавіта таму яшчэ ў 1988 г. пры ім быў створаны савет садзейнічання бібліятэчнай справе. Ён дапамагаў бібліятэкам у набыцці кніг з антыкварна-букіністычных аукцыёнаў, перадаваў у фонды бібліятэк для захавання і вывучэння розныя дакументы, мастацкія творы, дараваў бібліятэкі з аўтографамі беларускіх пісьменнікаў. З мэтай актывізацыі ролі бібліятэк у адраджэнні нацыянальнай культуры, прапаганды яе гісторыі і лепшых набыткаў, упершыню ў 1992 г. па ініцыятыве савета быў аб'яўлены штогадовы конкурс "Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры" сярод дарослых, дзіцячых і школьных бібліятэк, па выніках якога ўстанаўліваліся грашовыя прэміі, уручаліся дыпломы. За 6 год у конкурсе прыняла ўдзел каля 300 бібліятэк са ўсіх рэгіёнаў Беларусі. Творчае спаборніцтва вызначыла 54 бібліятэкі-пераможцы. Вынікі сведчаць аб тым, што шмат бібліятэк набылі сапраўднае нацыянальнае аблічча, узбагаціліся цікавымі формамі работы. Пераможцы першага конкурсу вельмі актыўныя і сёння. Гэта — Уздзенская, Іванаўская, Клімавіцкая раённыя, Мядзельская і Гродзенская гарадскія, Маладзечанская, Асіповіцкая дзіцячыя, шэраг сельскіх і школьных бібліятэк.

Са шматлікіх куткоў Беларусі ідуць на адрас Фонду культуры інфармацыйныя паведамленні, справаздачы, водгукі чытачоў, з густам аформленыя альбомы, афішы, у якіх мовай фотаздымкаў, дакументаў паведамляецца аб высакароднай справе сумленных, бясконца адданых сваёй прафесіі людзей. І дзе б яны ні працавалі — у ціхіх сельскіх бібліятэках, раённых, абласных ці ў сталічных — усюды бескарыслівых абаронцаў духоўнасці турбуе лёс бібліятэк.

Заўсёды цяжка вылучыць лепшых сярод лепшых, але вынікі падведзены. Віншуем пераможцаў!

Нагадваем, конкурс, які стаў ужо добрай традыцыяй, працягваецца. Хочацца верыць, творчыя і фінансавыя намаганні ўдзельнікаў і арганізатараў дабрачыннай акцыі прайшлі недарэмна.

*Людміла Кірухіна,*
*старшыня савета садзейнічання бібліятэчнай справе Беларускага фонду культуры*